УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»
_________________ А.П.Бяценя
«29» чэрвеня 2023 г.
Рэгістрацыйны № УД-332/02/08-1 /вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ КУЛЬТУРЫ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па модулі для спецыяльнасці:

6-05-0231-01 «Сучасныя замежныя мовы (з назначэннем моў)»

2023 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі I ступені па спецыяльнасці 6-05-0231-01 “Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)”, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і вучэбнага плана па напрамках спецыяльнасці 6-05-0231-01 “Сучасныя замежныя мовы (англійская мова і другая замежная мова)”

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
Бурдзялёва І.А., дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Воінава-Страха М.М., загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук;
Кныш Л.С., дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Семянькевіч А.В., дацэнт кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”, кандыдат філалагічных навук;
Казакевіч Т.Г., старшы выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”;
Сігаева С.А., старшы выкладчык кафедры беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”
(пратакол № 12 ад 07.06.2023);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”
(пратакол № 10 ад 29.06.2023).

# І. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Модуль “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” ўключае дзве вучэбныя дысцыпліны “Дыскурсіўныя практыкі камунікацыі” і “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай”, з'яўляецца часткай лінгвістычнай падрыхтоўкі выкладчыкаў замежнай мовы.

Мэта вывучэння вучэбных дысцыплін модуля – развіццё ў студэнтаў дыскурсіўнай камунікатыўнай кампетэнцыі, а таксама адпаведных літаратуразнаўчых кампетэнцый – прадметных і аперацыянальных.

Асноўнымі задачамі вывучэння вучэбных дысцыплін модуля з'яўляюцца:
1) азнаямленне навучэнцаў з моўнымі асаблівасцямі аргументатыўнай прамовы;
2) фарміраванне ўменняў пры дапамозе пэўных маўленчых структур пабудовы маналагічнага і дыялагічнага выказвання;
3) развіццё навыкаў валодання маўленчымі структурамі вядзення гутаркі, дыскусіі.
4) фарміраванне сістэмы ведаў па гісторыі беларускай літаратуры XI–XXI стст., яе ідэйна-мастацкіх асаблівасцях, жанравай сістэмы, нацыянальнай спецыфікі і месца ў сусветным літаратурным працэсе.
5) азнаямленне з асноўнымі прынцыпамі літаратуразнаўчай кампаратывістыкі і герменеўтыкі;
6) развіццё навыкаў самастойнага аналізу твора з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце.

У сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0231-01 “Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)” вучэбныя дысцыпліны модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” з'яўляюцца дысцыплінамі кампанента УВА.

Веданне модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” неабходна для вывучэння наступных вучэбных дыцыплін: “Беларуская мова ў прафесійнай дзейнасці”, “Замежная літаратура”.

У выніку вывучэння модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” студэнты павінны *ведаць:*
– тэарэтычныя асновы аргументацыі і дыскусіі;
– моўныя сродкі, характэрныя для розных тыпаў дыскурсаў;
– моўныя асаблівасці аргументативной прамовы;
– асаблівасці літаратурнага працэсу ў Беларусі ў XI – XXI стст. у кантэксце сусветнага літаратурнага развіцця;
– літаратурныя напрамкі, плыні, мастацкія метады, вобразна- выяўленчыя сродкі мастацкіх твораў;
– тыпалагічна і кантактна блізкія праявы літаратурнага жыцця Беларусі і свету;

*умець*:
– знаходзіць факталагічную, змястоўна-падтэкставую лінгвістычную інфармацыю з розных тыпаў тэкстаў;
– лагічна і доказна весці дыялог, гутарку, дыскусію, выкарыстоўваючы неабходныя маўленчыя структуры;
– істэматызаваць і абагульняць фактычны матэрыял, які адлюстроўвае асаблівасці літаратуры розных гістарычных перыядаў;

– аналізаваць твор з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці ў гісторыка-літаратурным кантэксце.

*валодаць:*

– маўленчымі структурамі, дыскурсіўная прыёмамі і тактыкаімі для паспяховага вядзення дыскусіі;
– навыкамі літаратуразнаўчага, кампаратывісцкага, герменеўтычнага аналізу мастацкіх тэкстаў, тэарэтычнымі ведамі, неабходнымі для аналізу твораў літаратуразнаўчымі катэгорыямі, паняццямі і тэрмінамі.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам па спецыяльнасці 6-05-0231-01 “Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)” вывучэнне модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” павінна забяспечыць фарміраванне наступных **сацыяльна-асобасных** кампетэнцый:
СК-13. Выкарыстоўваць веды пра сістэму беларускай мовы і заканамернасці яе развіцця ў розных відах дыскурсаў.
СК-29. Прымяняць веды аб развіцці нацыянальнай літаратуры для вырашэння прафесійных задач з улікам культурна-гістарычнага кантэксту і глабалізацыйных працэсаў.

Змест модуля, формы кантролю і тэхналогіі навучання накіраваны не толькі на набыццё навучэнцамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў, неабходных для асваення спецыяльнасці, але і на развіццё каштоўнасна-асобаснага, духоўнага патэнцыялу навучэнцаў, фарміравання ў іх грамадзянска-патрыятычных якасцяў, гатоўнасці да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0231-01 “Сучасныя замежныя мовы (з пазначэннем моў)” агульная колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры”, складае 108 акадэмічных гадзін, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 70 гадзін. Самастойная работа студэнтаў плануецца ў аб'ёме 38 акадэмічных гадзін.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Дыскурсіўныя пратыкі камунікацыі” адводзіцца 54 акадэмічныя гадзіны, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 34 гадзіны. Самастойная работа студэнтаў плануецца ў аб'ёме 20 акадэмічных гадзін.

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай” адводзіцца 54 акадэмічныя гадзіны, з іх колькасць аўдыторных гадзін складае 36 гадзін (20 гадзін лекцыйных і 16 гадзін практычных заняткаў). Самастойная работа студэнтаў плануецца ў аб'ёме 18 акадэмічных гадзін.

Модуль вывучаецца на працягу 2 семестраў (1 семестра для вучэбнага плана скарочанага тэрміну навучання) на 1 курсе.

Формай прамежкавай атэстацыі па модулі з'яўляецца залік па заканчэнні 2 семестра. Працаёмкасць модуля “Беларуская мова і літаратура ў кантэксце сусветнай культуры” складае 3 заліковыя адзінкі.

Вучэбныя дысцыпліны модуля вывучаюцца на беларускай мове.

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – вочная (дзённая).